6. *Шунейко, Е. Ф.* Пленэр / Е. Ф. Шунейко // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. – Е. 6 / редкол.: Г. П. Пашков [и др.] – Минск : Беларус. энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2008. – 752 с. : ил. – С. 97.

***В. У. Рагачова,***
*кандыдат педагагічных навук,*
*дацэнт, дацэнт кафедры педагогікі*
*сацыяльна-культурнай дзейнасці*

# АСАБЛІВАСЦІ СТАНАЎЛЕННЯ СІСТЭМЫ ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ СФЕРЫ ЗА МЯЖОЙ

Этап сучаснага сацыяльна-культурнага развіцця Рэспублікі Беларусь пазначыў неабходнасць абнаўлення асноўных прыярытэтаў у сістэме прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы. Новая канцэпцыя вышэйшай адукацыі змяніла акцэнт падыходу ў падрыхтоўцы будучых спецыялістаў з вузкапрофільнага на асобаснае развіццё з улікам шматстайных прафесійных якасцяў, сацыяльных функцый і роляў у грамадстве. У сувязі з гэтым становіцца неабходным аб'ектыўнае вывучэнне гісторыі і сучасных тэндэнцый вырашэння кадравага пытання ў замежных краінах.

Навучанне мастацтвам у Еўропе налічвае не адно тысячагоддзе. У гістарычным развіцці заходнееўрапейскай адукацыі ў галіне культуры і мастацтва Я. А. Сяргееў вылучае шэраг наступных этапаў. Першы этап – гэта этап станаўлення сістэмы адукацыі ў Сярэднія вякі, які пачынаецца з канца V ст. У гэты перыяд фарміруюцца ідэалогія, змест, формы, метады і арганізацыя сярэднявяковай адукацыі, якая становіцца справай царквы. Педагогіка сярэднявечча ляжала на прыярытэтным значэнні духу над целам, а архітэктура, скульптура, музыка спрыялі ўмацаванню веры ў Бога. Другі этап доўжыўся з другой паловы VIII па другую палову IX ст. Дзякуючы дзейнасці Карла Вялікага ў гэты час быў дадзены першы імпульс развіццю адукацыі: удасканалены яе змест і арганізацыя, адкрыты элементарныя школы пры сельскіх цэрквах і школы, якія давалі больш высокую адукацыю, пры буйных цэрквах і манастырах. Вялікі ўплыў на адукацыйныя працэсы аказвала сярэднявечная культура, якая была арыентавана на антычную рымскую куль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

туру. Трэці этап пачынаецца з XII ст., калі ў Еўропе складваецца свецкая сістэма адукацыі, якая мае пэўную аўтаномію і якая існавала разам з царкоўнымі школамі. У гэты перыяд значна павялічваецца аб'ём зместу адукацыі, асабліва ўніверсітэцкай. У яе ўключаецца шмат новых прадметаў і твораў. У гэты час ствараюцца новыя формы навучання: лекцыя, экзамен. У еўрапейскіх універсітэтах XII–XIII стст. ідзе стварэнне сваёй адукацыйнай культуры. Чацвёрты этап пачынаецца ў эпоху Адраджэння, якая выпрацавала новую ідэалогію і філасофію адукацыі, зацвердзіла разуменне яе вядучай ролі ў жыцці грамадства і чалавека, стварыла яе сістэму з класічным зместам і арыгінальнымі формамі (класна-ўрочнай) і метадамі (навучанне ў гульні, творчыя заданні, жывое вывучэнне моў і г. д.) навучання, накіраванымі на развіццё актыўнасці навучэнца, яго творчых здольнасцяў. Жывапіс, скульптура, літаратура і музыка эпохі Адраджэння паставілі ў аснову чалавека яго фізічную і духоўную прыгажосць як адлюстраванне прыгажосці боскай. Пяты этап можа быць аднесены да XVII ст. У гэты перыяд адбылося фарміраванне грамадскага і педагагічнага руху, які атрымаў назву Асветы, які выклікаў да жыцця філасофію і ідэалогію новай адукацыі. Найважнейшай для эпохі Асветы стала ідэя вырашальнай ролі адукацыі і асветы ў лёсах свету і кожнай краіны, кожнага саслоўя і кожнага чалавека. Пастпова ажыццяўляўся пераход ад старажытнакласічнага да нацыянальнага зместу адукацыі. З канца XIX ст. пачалася інтэнсіўная распрацоўка і мадэрнізацыя арганізацыйных формаў і тэхналогій навучання і выхавання, арыентаваных на творчае развіццё асобы [3].

Разам з развіццём агульнаадукацыйных тэхналогій навучання падрастаючага пакалення вядучыя заходнія краіны назапасілі пэўны вопыт у справе прафесійнай падрыхтоўкі кадраў сферы культуры і мастацтва. Тут трэба адзначыць, што ў адрозненне ад айчыннай сістэмы адукацыі, дзе вядзецца падрыхтоўка спецыялістаў для арганізацыі сацыяльна-культурнай дзейнасці, гістарычна ў замежных краінах гэта сфера звязана з паняццем вольнага часу, г. зн. сукупнасці відаў дзейнасці, прызначаных для задавальнення фізічных, духоўных і сацыяльных патрэбаў людзей у вольны час. Прычым вольны час як від дзейнасці служыць як адпачынку, так і развіццю асобы, задавальненню патрэбнасці ў забавах і зносінах.

У XX ст. кожная замежная краіна фарміруе ўласную канцэпцыю падрыхтоўкі спецыялістаў дасугавай сферы. Яе асноўныя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

формы і метады адлюстроўваюць нацыянальную культуру, традыцыі, спецыфіку грамадска-гістарычнага развіцця.

Брытанская мадэль падрыхтоўкі спецыялістаў для сацыяльна-культурнай сферы ўяўляе сабой сетку прафесійных курсаў універсітэтаў, на базе палітэхнічных інстытутаў і іншых спецыялізаваных навучальных устаноў і арганізацый. Маюцца таксама трох- і чатырохгадовыя курсы для пачаткоўцаў. У працэсе і на завяршальнай стадыі навучання студэнты стажыруюцца ва ўстановах культуры і рыхтуюць выпускныя работы на званне бакалаўра або магістра мастацтваў [2]. Таксама ў Брытаніі дзейнічаюць жаночыя і мужчынскія курсы, спецыфіка якіх заключаецца ў тым, што на курсах праходзяць падрыхтоўку кіраўнікі для працы з дзяўчынкамі і кіраўнікі для працы ў клубах з хлопчыкамі. Навучанне на курсах доўжыцца 1-2 гады (поўныя курсы) і ад 3 да 9 месяцаў (кароткатэрміновыя курсы). Падобныя курсы ствараюцца дзіцячымі і моладзёжнымі арганізацыямі. Тэарэтычныя заняткі на курсах праводзяцца паралельна з практычнай працай у маладзёжных арганізацыях.

У Францыі існуюць чатыры асноўных напрамкі падрыхтоўкі кадраў сацыяльна-культурнай сферы: падрыхтоўка спецыялістаў для сферы культуры (бібліятэк, музеяў, КДУ і т. п.); падрыхтоўка кіруючых кадраў для сістэмы культуры на мясцовым і дзяржаўным узроўнях; навучанне культурна-кіраўніцкім спецыяльнасцям у школах адміністрацыі і камерцыі; навучанне ва ўніверсітэтах, якое дае гуманітарныя веды, на базе якіх арганізуюцца адна- і двухгадовыя курсы павышэння кваліфікацыі з прысуджэннем ступені магістра культуры, магістра педагогікі, аніматара культурна-дасугавай сферы. У рамках Міністэрства культуры рыхтуюцца аніматары вольнага часу.

У Германіі ў апошнія гады ў шэрагу вышэйшых навучальных устаноў уведзены спецыялізаваныя курсы і праграмы, арыентаваныя на навучанне спецыялістаў для культурна-дасугавай сферы. У вышэйшай школе музычнага выхавання і відовішчных мастацтваў у Гамбургу ў агульную праграму навучання ўведзены курс «Менеджмент у сферы культуры». З 70–80-х гадоў ва ўсіх гарадах распачата падрыхтоўка педагогаў вольнага часу, якія ў першую чаргу працуюць з дзецьмі і займаюцца арганізацыяй сямейнага вольнага часу.

Арганізацыя навучання спецыялістаў для сацыякультурнай сферы ў Швецыі грунтуецца на канцэпцыі «культурнай камунікацыі»,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

г. зн. сістэме арганізаваных мер, накіраваных на забеспячэнне большай даступнасці твораў мастацтва і прадукцыі культуры, на актывізацыю ўдзелу людзей у вытворчым мастацтве і развіццё іх культурнай дзейнасці. Асноўнымі задачамі адміністратара ў гэтай сферы з'яўляюцца планаванне і правядзенне розных культурных мерапрыемстваў, размеркаванне субсідый, а таксама стымуляванне цікавасці шырокай публікі да пэўных відаў мастацтва. Сумяшчэнне адміністратарам дзвюх функцый – арганізацыйна-адміністрацыйнай і педагагічнай – прадугледжвае неабходнасць весці падрыхтоўку кадраў па двух напрамках. Так, адміністратар, які спецыялізуецца ў першым кірунку, павінен мець універсітэцкую ступень у пэўнай галіне мастацтва, а потым павышаць сваю кваліфікацыю ў абранай сферы культуры і вольнага часу.

У ЗША пачынаючы з 50-х гадоў XX ст. аддзелы адукацыі некаторых штатаў арганізавалі двухгадовыя курсы навучання арганізатараў вольнага часу з ліку выпускнікоў гуманітарных факультэтаў універсітэтаў. З сярэдзіны 60-х гадоў складаецца практыка падрыхтоўкі кіраўніцкіх кадраў у галіне культуры. Пачатак быў пакладзены фондам Форда, які арганізаваў інтэрнатуру для невялікай групы маладых кандыдатаў на пасаду адміністратараў у сферы культуры і мастацтва. Тым самым упершыню ўвага была прыцягнута да таго факта, што роля адміністратараў у культуры важная і мае сваю спецыфіку. У 1969 г. універсітэты штатаў Вісконсін і Каліфорнія ўвялі двухгадовыя праграмы з прысуджэннем ступеняў бакалаўраў педагогікі вольнага часу [1].

У цяперашні час у ЗША дзейнічаюць 25 праграм для мэнэджэраў у галіне сацыяльна-культурнай дзейнасці. Пры гэтым варта адзначыць, што ў праграмах розных універсітэтаў маюцца істотныя адрозненні. Некаторыя прысуджаюць ступень магістра мастацтваў, іншыя – магістра прыгожых мастацтваў, трэція – магістра кіраўніцкіх навук. Але ўсе яны маюць пэўнае падабенства, бо ўключаюць такія прадметы, як фінансаванне, псіхалогія службовых адносін, маркетынг, прававыя аспекты кіравання культурай, сацыяльна-культурная дзейнасць, тэорыя і практыка спонсарства і інш.

Прааналізаваўшы працэс падрыхтоўкі кадраў дасугавай сферы ў замежных краінах, можна канстатаваць, што адукацыйная сістэма дэмакратычных краін свету мае культуратворчую ма-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дэль, мэта якой складаецца не толькі ў спажыванні і трансляцыі ведаў, але і генерацыі здольнасці чалавека да аднаўлення ведаў у розных формах сацыяльна-культурнай практыкі, у прыватнасці вольнага часу.

Такім чынам, навуковае ўсведамленне і аналіз сутнасці, прыроды і спецыфікі падрыхтоўкі спецыялістаў дасугавай сферы ў замежных краінах дазволіць удасканаліць прафесіяграму спецыяліста сацыяльна-культурнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь, сфармуляваць патрабаванні, якія вылучаюцца грамадствам на сучасным этапе, вызначыць аб'ектыўныя магчымасці і ўмовы паляпшэння падрыхтоўкі спецыялістаў сацыяльна-культурнай сферы.


1. *Дуликов, В. З.* Социально-культурная деятельность за рубежом : учеб. пособие / В. З. Дуликов. – М. : МГУКИ, 2003. – 116 с.

2. *Кротова, Б. Н.* Педагогика досуга в англоязычных странах : учеб. пособие / Б. Н. Кротова. – СПб. : СПбГАК, 2004. – 162 с.

3. *Сергеев, А. Е.* Становление и развитие профессиональной подготовки специалистов социально-культурной сферы : автореф. дис. … д-ра пед. наук : 13.00.05; 13.00.08 / А. Е. Сергеев ; Моск. гос. ун-т культуры и искусств. – М., 2000. – 50 с.



***Л. І. Ракавецкая,***
*дацэнт кафедры менеджменту*
*інфармацыйна-дакументнай сферы,*
*кандыдат педагагічных навук, дацэнт*


## УЗАЕМАСУВЯЗЬ ІМІДЖА І САЦЫЯЛЬНАЙ АДКАЗНАСЦІ БІБЛІЯМЕНЕДЖЭРА

Імідж уяўляе сабой самапрэзентацыю арганізацыі або асобна ўзятага менеджэра. Гэта мэтанакіравана сфарміраваны вобраз, які вылучае пэўныя важнейшыя характарыстыкі і аказвае эмацыянальна-псіхалагічнае ўздзеянне на каго-небудзь. Імідж гаворыць аб знешнім вобліку і ўнутраным свеце чалавека, а таксама аб яго псіхалагічным тыпе. Імідж менеджэра складаецца з усёй сукупнасці рыс: маральнага і знешняга вобліку, размовы, манеры паводзін і нават умення абыходзіцца з людзьмі. Найбольшы шанс павысіць свой імідж маюць добразычлівыя, аптымістычныя і ветлівыя менеджэры [5].

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ